ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
8 мая 2018 г. № 37

# Аб унясенні змяненняў у пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. № 101

На падставе падпунктаў 4.6 і 4.26 пункта 4 Палажэння аб Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2011 г. № 1049 «Об изменении, дополнении и признании утратившими силу некоторых постановлений Правительства Республики Беларусь по вопросам образования», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу), зацверджаную пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2012 г. № 101 (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 20.10.2012, 8/26473; 13.05.2014, 8/28651; 06.12.2014, 8/29333; 30.05.2017, 8/32073), наступныя змяненні:

1.1. пункт 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«11. Атэстацыйная камісія ствараецца ў арганізацыі сістэмы адукацыі, структурных падраздзяленнях абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, – аддзел (упраўленне) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа).»;

1.2. частку пятую пункта 14 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«У рабоце атэстацыйнай камісіі могуць прымаць удзел па аднаму ўпаўнаважанаму прадстаўніку аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і вышэйстаячага прафсаюзнага органа.»;

1.3. у пункце $20^1$ словы «начальніка ўпраўлення адукацыі абласнога выканаўчага камітэта (старшыні камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта)» замяніць словамі «кіраўніка структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі»;

1.4. у частцы першай пункта 34 і частцы першай пункта 35 словы «дзяржаўнай установе адукацыі «Інстытут культуры Беларусі» замяніць словамі «ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

1.5. у частках першай і трэцяй пункта 54 словы «ўпраўлення адукацыі абласнога выканаўчага камітэта (камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта)» замяніць словамі «структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі»;

1.6. у пункце 4 дадатка да гэтай Інструкцыі словы «Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут культуры Беларусі» замяніць словамі «Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання, за выключэннем падпунктаў 1.1–1.3 і 1.5 пункта 1, якія ўступаюць у сілу з 1 чэрвеня 2018 г.

**Міністр** **І.В.Карпенка**

УЗГОДНЕНА
Міністр працы
і сацыяльнай абароны
Рэспублікі Беларусь
І.А.Касцевіч
25.04.2018

УЗГОДНЕНА
Міністр аховы здароўя
Рэспублікі Беларусь
В.А.Малашка
23.04.2018

УЗГОДНЕНА
Міністр культуры
Рэспублікі Беларусь
Ю.П.Бондар
02.05.2018

УЗГОДНЕНА
Міністр спорту і турызму
Рэспублікі Беларусь
С.М.Кавальчук
23.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
А.В.Ліс
25.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
М.М.Шарснёў
23.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.А.Дворнік
23.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.В.Краўцоў
23.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.В.Даманеўскі
25.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.М.Ісачанка
26.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
А.В.Шорац
24.04.2018

УЗГОДНЕНА
Старшыня Беларускага
прафесійнага саюза
работнікаў адукацыі і навукі
А.А.Бойка
23.04.2018